*Мікалай Плавінскі*

# БІТВА НА НЯМІЗЕ
## 3 сакавіка 1067 года



Беларусь у войнах

Серыя «Беларусь у войнах»

*Мікалай Плавінскі*

# БІТВА НА НЯМІЗЕ 3 САКАВІКА 1067 ГОДА



Мінск
«Медысонт»
2015

УДК 94(476)"1067"
ББК 63.3(4Беи)
П37

Серыя заснавана ў 2015 г.

Укладальнікі серыі «Беларусь у войнах»
*М.А. Плавінскі, М.У. Лазоўскі*
E-mail: belmilitary@gmail.com

Рэцэнзенты:

доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры эканамічнай гісторыі Інстытута сацыяльна-гуманітарнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта
**Бохан Ю.М.**

кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
**Кошман В.І.**

**Плавінскі, М.А.**

П37 Бітва на Нямізе 3 сакавіка 1067 года / Мікалай Плавінскі. — Мінск : Медысонт, 2015. — 54 с. : іл. — (Серыя «Беларусь у войнах»).

ISBN 978-985-7085-93-4.

Кніга прысвечана адной з самых знакамітых падзей айчыннай гісторыі эпохі Сярэднявечча — бітве на Нямізе, якая адбылася 3 сакавіка 1067 г. На падставе аналізу пісьмовых і археалагічных крыніц аўтар імкнецца рэканструяваць асноўныя падзеі, якія папярэднічалі гэтай бітве, яе ход, вынікі і наступствы.

Разлічана на шырокае кола чытачоў, зацікаўленых археалогіяй і гісторыяй Беларусі.

**УДК 94(476)"1067"**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-7085-93-4**

© Плавінскі М.А., 2015
© Афармленне. ТАА «Медысонт», 2015

# ЗМЕСТ

**ПЕРАДУМОВЫ** ........ *7*

**РАЦЬ УСЯСЛАВА,**
**АЛЬБО ВАЙНА 1065–1084 ГАДОЎ** ........ *15*

*ПЕРШЫ ЭТАП ВАЙНЫ: АД ПСКОВА*
*І НОЎГАРАДА ДА МЕНСКА І НЯМІГІ* ........ *15*

*ШТУРМ МЕНСКА* ........ *21*

*БІТВА НА НЯМІЗЕ* ........ *24*

*ДРУГІ ЭТАП ВАЙНЫ: АД ОРШЫ І КІЕВА*
*ДА НОЎГАРАДА І ГАЛАЦІЧАСКА* ........ *32*

*ТРЭЦІ ЭТАП ВАЙНЫ: АБАРОНЧЫЯ БАІ* ........ *40*

**ВЫНІКІ УСЯСЛАВАВАЙ РАЦІ** ........ *48*

**ЛІТАРАТУРА** ........ *51*

**Б**ітва на Нямізе – адна са знакавых падзей айчыннай гісторыі. Знакавая яна хаця б таму, што менавіта ў сувязі з ёй упершыню згадваецца беларуская сталіца. Знакавая і, разам з тым, зусім малавядомая, зрэшты, як і шмат якія іншыя падзеі шматвекавой і шматпакутнай гісторыі нашай Бацькаўшчыны. Але, у адрозненне ад іншых старонак нашага мінулага, бітва на Нямізе застаецца малавядомай, найперш, па аб'ектыўных прычынах. І галоўная з іх – малалікасць і малаінфарматыўнасць гістарычных крыніц, якія пра яе распавядаюць. Фактычна, мы ведаем пра гэтую падзею толькі з летапіснага паведамлення: ***«Ярославличи же трие, Изяславъ, Святославъ, Всеволодъ, совокупивше воя, идоша на Всеслава зимѢ сущи велицѢ. И придоша къ МѢньску, и МѢнянѢ затворишася вь градѢ; си же братья взяша МѢнескъ, исьсѢкоша мужи, а жены и дѢти***



*Усяслаў Чарадзей. Малюнак Язэпа Драздовіча, 1920 год*

***взяша на щиты, и поидоша кь НемизѢ; и Всеславъ поиде противу. И совокупившеся обои на НемизѢ, мѢсяца марта вь 3 день, и бяше снѢгъ великъ, и поидоша противу собѢ; и бысть сѢча зла, падоша мнозѢ, и одолѢ Изяславъ, Святославъ, Всеволодъ, а Всеславъ бѢжа».***

Яшчэ адно невялічкае вершаванае апісанне бітвы пакінуў невядомы аўтар «Слова аб палку Ігаравым», які напісаў пра яе больш як праз сто год пасля таго, як яна адбылася:

***На НемизѢ снопы стелють головами,***
***молотятъ чепи харалужными,***
***на тоцѢ животъ кладутъ,***
***вѢютъ душу отъ тѢла.***

***НемизѢ кровави брезѢ***
***не бологомъ бяхуть посѢяни –***
***посѢяни костьми рускихъ сыновъ.***

Усяго некалькі радкоў, у якія ўклалася апісанне штурма летапіснага Менска і крывавай бітвы, што адбылася пасля гэтага. Але колькі старонак, артыкулаў, нарысаў, главаў і раздзелаў у розных выданнях было створана пра яе сучаснымі гісторыкамі і пісьменнікамі! Кожны аўтар спрабаваў выкласці ўласнае ўяўленне аб прычынах, характары і наступствах бітвы на Нямізе. І гэта толькі пацвярджае значэнне самой падзеі для нашай гісторыі.

Мы таксама паспрабуем дадаць да неабсяжнай літаратуры, прысвечанай бітве на Нямізе, яшчэ некалькі дзясяткаў старонак. Мы будзем разглядаць бітву з пазіцый мілітарнай гісторыі, а менавіта яе перадумовы, тактычныя асаблівасці і стратэгічныя наступствы, наколькі гэта дазваляе сучасны стан вывучэння гістарычных крыніц і дадзеных археалагічных даследаванняў аб развіцці вайсковай справы варагуючых бакоў.

# ПЕРАДУМОВЫ

**Г**історыя Полацкага княства XI стагоддзя звязана з імёнамі двух выбітных валадароў – Брачыслава Ізяславіча і яго сына Усяслава, які з цягам часу атрымаў у гістарычнай літаратуры трывалую мянушку Чарадзей. Брачыслаў кіраваў Полацкім княствам больш як 40 гадоў. За гэты час ён паспеў пашырыць і ўмацаваць межы сваёй зямлі, назапасіць значны ваенна-эканамічны патэнцыял і зарабіць паважны палітычны аўтарытэт. Усё гэта ён перадаў у спадчыну свайму адзінаму сыну.

Усяслаў атрымаў ад бацькі вялізныя ўладанні, якія ахаплівалі ўсю Паўночную і значную частку Цэнтральнай Беларусі. Праз колішнюю тэрыторыю Полацкага княства праходзіць галоўны водападзел еўрапейскіх рэк, з якога ў паўночным накірунку сцякаюць Заходняя Дзвіна і Ловаць, а ў паўднёвым – Днепр, Бярэзіна, Друць. Наяўнасць разгалінаванай рачной сеткі прадвызначыла важную ролю Полацка ў сістэме міжнароднага гандлю. Асноўнай гандлёвай артэрыяй у рэгіёне з'яўляўся Днепр, па якім можна было даплысці да Чорнага мора, а праз сістэму волакаў у



*Рэканструкцыя меркаванага асабіста-родавага знака Усяслава Чарадзея (паводле Сяргея Бялецкага)*



*Знешні выгляд Полацкага Сафійскага сабора за часамі Усяслава Чарадзея (паводле Георгія Штыхава)*

мора Балтыйскае. Гэты шлях атрымаў назву «шляху з Вараг у Грэкі»: ***«бѣ путь изъ Варягъ въ Греки и изъ Грекъ по Днѣпру, и верхъ Днѣпра волокъ до Ловоти, и по Ловоти внити в Ылмерь озеро великое, из него же озера потечеть Волховъ и вътечеть в озеро великое Нево, и того озера внидеть устье в море Варяжьское»***. Прыблізна з сярэдзіны X стагоддзя актывізуецца выкарыстанне гандлёвага шляху па Дзвіне.

На большай частцы тэрыторыі Полацкага княства жылі крывічы – славянскае насельніцтва, на фарміраванне якога моцна паўплывалі папярэднія жыхары рэгіёна – усходнія балты. Крывічоў, якія жылі на Падзвінні, летапіс называе палачанамі.

Галоўным горадам княства быў Полацк. Акрамя таго, летапісныя крыніцы паведамляюць, што ў XI стагоддзі ўжо існавалі Віцебск, Усвяты, Лукомль, Друцк, Орша, Копысь, Лагойск, Заслаўе,



*Макет-рэканструкцыя Кіеўскага Сафійскага сабора*



*Наўгародскі крэмль і Сафійскі сабор*



*Знешні выгляд крывічанак (рэканструкцыя Людмілы Дучыц паводле матэрыялаў раскопак курганных могільнікаў паўночнага захаду Полацкай зямлі)*

Менск, Браслаў, Галацічаск, Одрэск (месцазнаходжанне двух апошніх дагэтуль застаецца не лакалізаваным). Верагодна, ужо ў XI стагоддзі ўзнікаюць полацкія фарпосты ў Ніжнім Падзвінні – гарады Кукенойс і Герцыке.

Пагалоска пра новага полацкага валадара пайшла задоўга да пачатку яго княжэння, бо нават нараджэнне Усяслава было, паводле меркавання сучаснікаў, звязана са звышнатуральнымі з'явамі – ***«его же роди мати от вълхвованья»***. Менавіта таму, на іх думку, ён ***«немилостивъ есть на кровьпролитье»***.

Першыя два дзесяцігоддзі княжэння Усяслава Брачыславіча ў Полацку былі, напэўна, працягам бацькавай палітыкі па ўмацаванні ваенна-эканамічнай магутнасці княства, павелічэнні яго палітычнага ўплыву і межаў дзяржавы.

Але, верагодна, ужо праз некалькі гадоў пасля свайго ўвакняжэння малады полацкі валадар пачынае выношваць планы ўзвышэння свайго княства. Першым вядомым нам крокам на гэтым шляху стала пабудова ў Полацку новага велічнага храма – Сафійскага сабора. Узвядзенне Сафійскага сабора было сімвалічным актам, бо на той час на Русі існавала толькі два такіх храмы – у Кіеве і ў Ноўгарадзе. Пабудова Усяславам уласнай Сафіі, відавочна, сведчыла, што ён разглядае свой стольны горад як найменш роўным Кіеву і Ноўгараду, а ў перспектыве, пры ўдалым збегу абставінаў, магчыма, і вышэйшым за іх.



*Полацкі дружыннік першай паловы XI стагоддзя (рэканструкцыя аўтара)*

Разам з тым, полацкі князь, відавочна, да пэўнага часу працягваў назапашваць свае сілы, а таму падтрымліваў саюзніцкія адносіны са сваімі паўднёвымі суседзямі. Так, у 1060 годзе дружыны Усяслава



*Сучасны выгляд Полацкага Сафійскага сабора*

разам з войскамі Ізяслава, Святаслава і Усевалада Яраславічаў узялі ўдзел у пераможным паходзе супраць качэўнікаў торкаў (народ цюркскага паходжання, які пражываў у паўднёварускіх стэпах). Але ўжо ў дастаткова хуткім часе пасля гэтай выправы Усяслаў пачынае вайну са сваімі былымі саюзнікамі.



*Сумесная выправа Яраславічаў і Усяслава на торкаў, мініяцюра Радзівілаўскага летапісу канца XV стагоддзя*




*Полацкае княства на мапе Усходняй Еўропы*




*Полацкае княства ў часы Усяслава Чарадзея*

# РАЦЬ УСЯСЛАВА, АЛЬБО ВАЙНА 1065–1084 ГАДОЎ

***«Заратися Всеславъ, сынъ Брячьславль Полотьский»*** – такімі словамі летапісец азаглавіў апісанне вайсковых дзеянняў, што распачаў полацкі князь у 1065 годзе. Невядома, якія менавіта мэты ставіў перад сабой Усяслаў, пачынаючы вайну са значна пераўзыходзіўшымі яго па эканамічных рэсурсах і вайсковым патэнцыяле паўднёварускімі князямі Яраславічамі. Збіраўся ён пашырыць сваю тэрыторыю за кошт суседніх земляў, ці сапраўды песціў надзею падпарадкаваць сваёй уладзе ўсе ўсходнеславянскія княствы, нам не вядома. Але, напэўна ж, ён першапачаткова не мог сабе нават уявіць, што гэтая «раць» (менавіта такім словам называлі ў тыя часы вайну) працягнецца ажно два дзесяцігоддзі.

## *ПЕРШЫ ЭТАП ВАЙНЫ: АД ПСКОВА І НОЎГАРАДА ДА МЕНСКА І НЯМІГІ*

Баявыя дзеянні, якія распачаў полацкі князь, вяліся на велізарнай прасторы ад Ноўгарада на поўначы да Кіева на поўдні і адрозніваліся працягласцю і зацятасцю. У 1065 годзе ён напаў на паўночнага суседа Полацка – Пскоў, але ўзяць горад не здолеў. Затое ў наступным 1066 годзе Усяслаў ***«отвори врата Новуграду»*** – захапіў і разрабаваў найбуйнейшы паўночнарускі горад. Наўгародцы былі выведзены ў палон, акрамя таго, Усяслаў вывез з Сафійскага сабора званы і царкоўнае начынне для аздаблення ўласнай Полацкай Сафіі.




*План Пскова XI – першай паловы XIII стагоддзя (паводле Сяргея Сцяпанава)*

Натуральна, што падобныя дзеянні не маглі не выклікаць адпаведнай рэакцыі братоў Яраславічаў. Яны сабралі войскі і рушылі ў выправу на землі, падуладныя Усяславу. Для нападу яны абралі зімовы час, чаму, напэўна, меліся дзве асноўныя прычыны. Першай з іх была, верагодна, неабходнасць як мага хутчэй адпомсціць полацкаму князю за захоп Ноўгарада. Другая заключалася ў тым, што зімовы час быў зручным для хуткага перасоўвання




*План сярэднявечнага Ноўгарада*



Рэканструкцыя мацавання ледаходнага шыпа і ледаходныя шыпы з памежнай полацкай крэпасці Прудніке

войскаў. Сухапутныя шляхі зносінаў у XI стагоддзі былі яшчэ вельмі нешматлікімі, таму найбольш зручным і хуткім для войска быў рух па рэках – на лёгкіх рачных суднах з вясны да восені і на конях узімку. Каб конскія капыты не слізгалі па лёдзе, выкарыстоўваліся адмысловыя ледаходныя шыпы.

Стратэгічныя планы Яраславічаў нам невядомыя – зараз немагчыма сказаць, ці збіраліся яны дайсці да сталіцы Полацкага княства, ці меркавалі толькі вынішчыць яго паўднёвыя землі, але ў кожным выпадку, аб'ектам для першага ўдару быў абраны горад Менск. Выбар гэты быў зусім не выпадковым, бо Менск на той момант быў найбуйнейшым гандлёвым і адміністратыўным цэнтрам на поўдні Полацкай зямлі. Да таго ж, да яго было дастаткова лёгка дабрацца па замёрзлых рэках з поўдня Русі, бо першапачатковы Менск размяшчаўся на рацэ Менка – невялічкім прытоку Пцічы, якая, у сваю чаргу, упадае ў Прыпяць. Адпаведна, можна меркаваць, што маршрут аб'яднанага войска Яраславічаў пралягаў менавіта па Прыпяці і Пцічы.



Вал Менска на Менцы




*План Менска на Менцы ў сярэдзіне XI стагоддзя (паводле Георгія Штыхава)*

Яраславічы дасягнулі першай мэты сваёй выправы дзесьці на самым прыканцы зімы ці ў першыя дні сакавіка. Мяркуючы па аповедзе летапісца, напярэдадні трагічных падзей стаяла марознае надвор'е – ***«зимѢ сущи велицѢ»***.




*Дзеянні войскаў Яраславічаў і Усяслава напярэдадні бітвы на Нямізе (рэканструкцыя аўтара)*



*Напад Усяслава на Ноўгарад і яго ўзяцце*



*Узяцце Менска войскамі Яраславічаў, мініяцюры Радзівілаўскага летапісу канца XV стагоддзя*

# ШТУРМ МЕНСКА

У сярэдзіне XI стагоддзя Менск быў вялікім па ўсходнееўрапейскіх мерках гарадскім цэнтрам. Размешчаны пры ўпадзенні ў Менку ручая Дуная, горад складаўся з умацаванага цэнтра – так званых малога і вялікага гарадзішчаў агульнай плошчай каля 1,3 гектара, і вялізнага адкрытага паселішча плошчай не менш за 40 гектараў, дзе пражывалі пераважна гандляры і рамеснікі. Акрамя таго, Менск быў цэнтрам вялікай сельскагаспадарчай акругі ў вярхоўях Пцічы і Свіслачы, таму, верагодна, пад абарону гарадскіх сцен магла сабрацца значная колькасць навакольных жыхароў, якія ратаваліся ад гвалту і рабункаў, што непазбежна спадарожнічалі кожнаму наезду варожага войска. Зрэшты, нават аб гэтым мы можам меркаваць толькі гіпатэтычна, бо не вядома, наколькі хутка рухаліся войскі Яраславічаў. Але рухаліся яны, напэўна, імкліва, бо Менск быў, верагодна, толькі пачатковым пунктам іх выправы, якую варта было скончыць да пачатку сапраўднай вясны.



*Узбраенне полацкіх ваяроў XI стагоддзя (паводле Георгія Штыхава, Юрыя Заяца і аўтара)*



*Прарэзка вала Вялікага гарадзішча Менска на Менцы (паводле Георгія Штыхава)*

У кожным выпадку, мы дакладна ведаем, што калі Яраславічы ***«придоша къ МѢньску», «МѢнянѢ затворишася вь градѢ»*** – схаваліся ўнутры ўмацаванняў і падрыхтаваліся да абароны. Меняне, відавочна, спадзяваліся на магутнасць сваіх умацаванняў, якія маглі дапамагчы ім адбіць варожы штурм ці нават прадухіліць яго спробы. Справа ў тым, што ў гэты час штурмы крэпасных умацаванняў на Русі былі выключна рэдкімі. Звычайна вораг абмяжоўваўся аблогай, якая магла працягвацца, пакуль абложаныя не здаваліся на міласць пераможцаў. Улічваючы зімовы час, штурм быў яшчэ больш складанай справай, бо і без таго стромкія схілы валоў былі ў дадатак зледзянелымі, што рабіла іх яшчэ больш непрыступнымі.



*Наканечнік похваў мяча са слою пажарышча на гарадзішчы Менска на Менцы (паводле Георгія Штыхава)*

Верагодна, жыхары Менска спадзяваліся пратрымацца за сваімі сценамі да падыходу войскаў Усяслава, якія маглі б дэблакаваць горад і адбіць варожы напад.

Але здарылася інакш. Яраславічы ўсё ж наважыліся кінуць свае войскі на штурм. Мусіць, яны таксама разлічвалі, што полацкі князь памкнецца не дапусціць захопу найбуйнейшага горада на поўдні сваёй зямлі. Меняне ўпарта абараняліся, але ворагі ўсё ж здолелі захапіць гарадскія ўмацаванні, панесшы, відаць, значныя страты. Раз'юшаныя зацятым супраціўленнем, нападнікі спалілі горад, ***«исьсѢкоша мужи, а жены и дѢти взяша на щиты»*** – вывелі ў палон. Можна толькі ўявіць сабе карціну бязлітаснага вынішчэння горада і яго жыхароў.

Пасля спалення Менска Яраславічы накіраваліся на поўнач – у вярхоўі Свіслачы, дзе на беразе яе невялічкага правага прытока – рачулкі Нямігі – яны сустрэліся з Усяславам, які мчаўся на дапамогу менянам.




*Рэчышча Нямігі на плане Мінска 1898 года*

## БІТВА НА НЯМІЗЕ

Такім чынам, 3 сакавіка 1067 года на беразе невялічкай Нямігі сустрэліся два войскі. Адбылося гэта ў цэнтры сучаснай беларускай сталіцы, верагодна, дзесьці непадалёк ад месца ўпадзення Нямігі ў Свіслач, побач з пазнейшым Замчышчам.

Адным з галоўных пытанняў з'яўляецца тое, якія сілы мелі праціўнікі перад боем, бо ва ўмовах сярэднявечных бітваў колькасць войскаў часта магла адыграць вырашальную ролю ў перамозе таго ці іншага з бакоў. На жаль, адказы на гэтае пытанне могуць быць толькі гіпатэтычнымі, бо ніякіх пісьмовых звестак мы не маем. Таму нам застаецца толькі выказваць пэўныя развагі аб мабілізацыйных здольнасцях бакоў у канкрэтнай стратэгічнай і тактычнай сітуацыі, якая склалася напярэдадні бітвы.

Відавочна, што мабілізацыйныя здольнасці кааліцыі паўднёварускіх князёў былі ў разы, і нават у дзясяткі разоў большымі, чым адпаведныя рэсурсы Усяслава Чарадзея. З падуладных ім земляў Яраславічы, у выпадку крайняй неабходнасці, маглі б сабраць і некалькі дзясяткаў тысяч ваяроў рознай ступені падрыхтоўкі. У той жа час, можна меркаваць, што шырокамаштабнай мабілізацыі Яраславічы не праводзілі. Па-першае, іх «падціскаў час», бо трэба было неадкладна «пакараць» Усяслава за разарэнне Ноўгарада і, пры гэтым, паспець завяршыць выправу да пачатку



*Вытокі Нямігі, фота 1920 года*

*Выява дружынніка. Ноўгарад, першая палова XIII стагоддзя (паводле Барыса Колчына)*



вясны, калі таянне снягоў і паводкі зрабілі б хуткае перасоўванне войскаў практычна немагчымым.

У такіх умовах войска, што рушыла ў карную выправу на палачан, павінна было быць мабільным і складацца са спрактыкаваных ваяроў. Іначай кажучы, хутчэй за ўсё, Яраславічы аб'ядналі для нападу на землі Усяслава свае ўласныя дружыны, якія маглі агулам налічваць да некалькіх тысяч чалавек. Кожны з іх быў прафесійным ваяром, які меў добрае засцерагальнае і наступальнае ўзбраенне. Відавочна, што войска Яраславічаў складалася выключна з вершнікаў, прычым верагодна, што ваяры мелі падчас такой далёкай выправы не аднаго, а некалькі коней, якія выкарыстоўваліся на змену, што дазваляла яшчэ больш падвысіць хуткасць руху.

Што мог супрацьпаставіць кааліцыйнаму войску полацкі князь? Паспрабуем прааналізваць прыкладны склад полацкага войска і яго магчымую колькасць.

Войска, якое меў у сваім распараджэнні Усяслаў Брачыславіч, складалася, у першую чаргу, з дружыны і апалчэння. Акрамя таго, у выпадку неабходнасці, асобныя вайсковыя аддзелы маглі наймацца, альбо набірацца з ліку падуладных Полацку балцкіх плямёнаў, якія ішлі ў выправу з мэтай узбагачэння за кошт атрымання здабычы.



*Каменны барэльеф XII–XIII стагоддзяў з выявай лучніка з Турава*

Асноўнай ударнай сілай войска была княжацкая дружына, якая знаходзілася ў пастаяннай баявой гатоўнасці. Дружына падзялялася на старэйшую і малодшую. Старэйшая дружына складалася з найбольш дасведчаных у вайсковай справе ваяроў, якія адначасова мелі высокі сацыяльны і маёмасны статус. Прадстаўнікі старэйшай



*Выява дружынніка. Ноўгарад, першая палова XIII стагоддзя (паводле Пятра Сарокіна і Алены Цянінай)*

дружыны былі княжацкімі дарадцамі, кіраўнікамі княжацкай адміністрацыі, а ў выпадку неабходнасці маглі кіраваць асобнымі вайсковымі аддзеламі – былі ваяводамі. Малодшая дружына складала аснову прафесійнага войска. Кола абавязкаў, якія маглі выконваць прадстаўнікі малодшай дружыны, было надзвычай шырокім. Акрамя ўласна ўдзелу ў вайне, яны маглі быць княжацкімі служкамі, ажыццяўляць адміністратыўныя функцыі – збіраць падаткі і разбіраць судовыя справы ў гарадах і сельскай мясцовасці.

Дружына, аднак, была адносна нешматлікай. Пэўная частка дружыннікаў пастаянна знаходзілася пры князі. Яны выконвалі княжацкія даручэнні і складалі, так бы мовіць, «атрад хуткага рэагавання» на выпадак супрацьстаяння нечаканаму варожаму нападу. Па некалькі дзясяткаў прафесійных ваяроў знаходзіліся ў кожным



*Выява дружыннікаў. Раслаўль, Смаленская вобласць, першая палова XIII стагоддзя (паводле Леаніда Аляксеева)*




*Атака цяжкаўзброеных вершнікаў, выява на дыване з Баё (Нармандыя), канец XI стагоддзя*

з гарадскіх цэнтраў. Акрамя таго, пэўная колькасць дружыннікаў ахоўвала памежныя крэпасці і выконвала адміністратыўныя функцыі ў сельскай мясцовасці.

Найбольш шматлікай часткай полацкага войска было апалчэнне, набранае з гараджан і сялян. Дзякуючы скліканню апалчэння можна было сабраць значныя па колькасці вайсковыя сілы. Але апалчэнцы не маглі ўдзельнічаць у далёкіх доўгатэрміновых выправах, бо гэта прывяло б да занядбання іх гаспадаркі.

Такім чынам, войска, якое патэнцыйна меў у сваім распараджэнні Усяслаў, магло налічваць у залежнасці ад мэтаў аперацыі і канкрэтных баявых абставінаў ад некалькіх сотняў да некалькіх тысяч чалавек. У выключных выпадках ён, верагодна, мог сабраць да дзесяці тысяч ваяроў, ці нават болей.



*Полацкі апалчэнец XI стагоддзя (рэканструкцыя Людмілы Дучыц паводле матэрыялаў курганнага могільніка Кублішчына Мёрскага раёна Віцебскай вобласці)*



*Шлемы XI стагоддзя з тэрыторыі Русі, Польшчы і Паўднёва-Усходняй Прыбалтыкі (паводле Рымы Валкайтэ-Кулікаўскенэ, Януша Гурэцкага, Здзіслава Жыгульскага, Анатоля Кірпічнікава, Анджэя Надольскага)*

Аднак збор такога вялікага войска трэба было доўга рыхтаваць, а напярэдадні бітвы на Нямізе часу на гэта не было зусім. Наколькі можна меркаваць, Усяслаў, атрымаўшы першыя звесткі аб уварванні войска Яраславічаў на поўдзень Полацкага княства, мусіў адразу ацаніць сітуацыю і неадкладна адрэагаваць на дзеянні ворага. Таму часу на скліканне вялікага войска і нават на збор усёй дружыны князь не меў. Верагодна, у выправу на абарону паўднёвых

тэрыторый княства разам з Усяславам рушылі тыя дружыннікі, што знаходзіліся ў Полацку, і частка найбольш баяздольных гараджан. Можна таксама меркаваць, што па ходу руху войска да яго далучаліся атрады дружыннікаў і гарадскія апалчэнні з цэнтральных і паўднёвых полацкіх гарадоў.

Войска імкліва рухалася на поўдзень. Пры спрыяльным збегу абставін вершнікі маглі адолець шлях ад Полацка да Менска літаральна за некалькі дзён. Зрэшты, Усяслаў Брачыславіч праславіўся сярод сучаснікаў і нашчадкаў імклівасцю перасоўвання яго вайсковых аддзелаў, што нават знайшло сваё паэтычнае адлюстраванне ў «Слове аб палку Ігаравым»:

***Всеславъ князь людемъ судяше,***
***княземъ грады рядяше,***
***а самъ въ ночь влъком рыскаше:***
***изъ Кыева дорискаше до куръ Тмутороканя,***
***великому Хръсови влъкомъ путь прерыскаше.***

Асноўнай дылемай для полацкага князя было альбо чакаць, пакуль да асноўнага войска паспеюць далучыцца падмацаванні з аддаленых гарадоў, альбо, не губляючы ні хвіліны, памкнуцца дапамагчы «затварыўшымся ў сваім градзе менянам», маючы толькі адносна невялікія сілы. Можна меркаваць, што Усяслаў абраў другі варыянт. І хоць абараніць Менск ён не паспеў, давялося прымаць бой з войскамі Яраславічаў прыкладна за 16 кіламетраў на



*Заслаўе, гарадзішча Замэчак (рэканструкцыя Юрыя Заяца, мастак Яўген Кулік)*

паўночны ўсход ад яго, каб прадухіліць магчымасць іх далейшага прасоўвання ўглыб полацкай тэрыторыі.

Такім чынам, у бітве на Нямізе сышліся кааліцыйнае войска Яраславічаў, якое цалкам складалася з прафесійных ваяроў-дружыннікаў, і войска Усяслава, якое, верагодна, таксама было складзена пераважна з дружыннікаў і найбольш баяздольных жыхароў Полацка, а таксама цэнтральных і паўднёвых гарадоў яго княства. Пры гэтым, колькасная перавага, відавочна, была на баку паўднёварускіх князёў.

Пра ход самой бітвы на Нямізе мы, на жаль, не можам сказаць амаль нічога больш пэўнага за летапіснае паведамленне: ***«И совокупившеся обои на НемизѢ, мѢсяца марта вь 3 день, и бяше снѢгъ великъ, и поидоша противу собѢ; и бысть сѢча зла, падоша мнозѢ»***.

Можна уявіць, як на заснежаных берагах Нямігі сышліся ў зацятай бойцы дзве масы вершнікаў. Бітва паміж імі – ***«сѢча зла»*** – была жорсткай і доўгай, што адзначыў не толькі летапісец, але і невядомы аўтар «Слова аб палку Ігаравым»:

***На НемизѢ снопы стелють головами,***
***молотять чепи харалужными,***
***на тоцѢ животъ кладуть,***
***вѢють душу отъ тѢла.***

***НемизѢ кровави брезѢ***
***не бологомъ бяхуть посѢяни –***
***посѢяни костьми рускихъ сыновъ.***

Зрэшты, зацятасць сечы ўжо сама па сабе шмат што кажа аб характары бітвы. Справа ў тым, што ў раннім Сярэднявеччы бітвы звычайна былі хуткацечнымі, а таму страты бакоў часцей за ўсё былі не надта вялікімі. На Нямізе ўсё было наадварот.



*Выява лучніка. Ноўгарад, першая палова XIII стагоддзя (паводле Марыны Радзівонавай і Аляксея Гіпіўса)*

У той жа час, зацятасць бітвы на Нямізе цалкам зразумелая. Яраславічы, якія мелі колькасную перавагу, імкнуліся адным махам расправіцца з ударнай часткай полацкага войска і атрымаць такім чынам магчымасць хутка захапіць усю тэрыторыю княства і яго сталіцу. У сваю чаргу, Усяславу не было куды адступаць, бо ён таксама разумеў, што навалу Яраславічаў трэба спыніць любымі сродкамі.

Нягледзячы на ўсю зацятасць змагання, полацкае войска мусіла адступіць: ***«и одолѢ Изяславъ, Святоставъ, Всеволодъ, а Всеславъ бѢжа»***. Але да гэтай пераможнай рэляцыі варта ставіцца дастаткова крытычна, бо яна была створана кіеўскім летапісцам, які, натуральна, адлюстроўваў погляд сваіх князёў. На самай справе, сітуацыя, відавочна, была не такой «ружовай», як яе хацела б бачыць кіеўская «прапаганда».

Хаця Усяслаў і быў вымушаны пакінуць поле бітвы, Яраславічы не здолелі атрымаць ад сваёй перамогі ні пэўных тактычных вынікаў, ні нейкіх стратэгічных выгадаў. Можна меркаваць, што перамога паўднёварускай кааліцыі сталася ў пэўным сэнсе «піравай», бо развіць нейкім чынам свой поспех яны не змаглі. Войска Яраславічаў не кінулася наўздагон Усяславу, каб канчаткова знішчыць рэшткі полацкіх дружын. Яно таксама не рушыла далей на поўнач, каб захапіць Полацк і такім чынам канчаткова пазбавіць свавольнага падзвінскага ўладара ўласнага ўдзелу. Яраславічы не сталі працягваць рабаванне паўднёвага памежжа Полацкага княства. Іх войска нават не здзейсніла спробы захопу размешчанага зусім побач ад месца бітвы на Нямізе полацкага горада Ізяслаўля (сучаснага Заслаўя). Відаць, нават на гэта сілаў у кааліцыйнага войска ўжо не было.

Такім чынам, відавочна, што, нягледзячы на спаленне Менска і адступленне з поля бітвы, Усяслаў Брачыславіч здолеў звесці магчымыя вынікі варожага нападу да мінімуму – не дапусціў спустошэння цэнтральных рэгіёнаў Полацкага княства і спробы захопу сталічнага горада Полацка. Апроч таго, вайсковыя сілы Полацкай зямлі, напэўна, засталіся цалкам баяздольнымі і былі гатовыя да працягу ваенных дзеянняў.

## ДРУГІ ЭТАП ВАЙНЫ: АД ОРШЫ І КІЕВА ДА НОЎГАРАДА І ГАЛАЦІЧАСКА

Тое, што Яраславічы не дасягнулі жаданых вынікаў сваёй выправы, а бітва на Нямізе не дазволіла ім атрымаць сур'ёзнай перавагі над Усяславам, стае зразумелым з далейшых падзей.

Браты-хаўруснікі вымушаны былі адкінуць планы ўзброенага падпарадкавання Полацкай зямлі і пагадзіліся на перамовы, якія былі прызначаны ў ліпені на Дняпры ля Оршы. Каб перамовы адбыліся, Яраславічы гарантавалі полацкаму князю бяспеку – ***«Изяславъ, Святославъ и Всеволодъ цѣловавше крест честныи къ Всеславу рекше ѥму приди к намъ ѩко не створимъ ти зла»***. Цалаванне крыжа было самай моцнай клятвай для тагачаснага чалавека, парушэнне якой разглядалася як смяротны грэх. Таму не дзіўна, што Усяслаў ***«надѣѩвъсѧ цѣлованьи креста и приѣхавъ в лодьи чересь Днѣпръ»***, прычым нават узяў з сабой на перамовы двух сваіх сыноў. Але Яраславічы здрадзілі сваёй прысязе і захапілі полацкага князя і яго сыноў у палон. Відаць, вайсковы аўтарытэт Усяслава быў вельмі вялікім, а відовішча крывавай сечы на Нямізе настолькі ўразіла братоў-хаўруснікаў, што яны вырашылі абраць здраду і не пабаяліся божага гневу, каб толькі пазбегнуць новых бітваў з полацкім князем.



*Раннесярэднявечны Кіеў (фрагмент дыярамы)*



*Бітва на Нямізе*



*Усяслаў з сынамі плыве праз Днепр на перамовы з Яраславічамі, мініяцюры Радзівілаўскага летапісу канца XV стагоддзя*




*Поруб сярэдзіны 40-х гадоў XI стагоддзя, выяўлены падчас раскопак у Ноўгарадзе (паводле Алега Алейнікава)*



*Кіеўляне вызваляюць Усяслава з поруба, мініяцюра Радзівілаўскага летапісу канца XV стагоддзя*



*Усяслаў з сынамі ў кіеўскім порубе, мініяцюра Радзівілаўскага летапісу канца XV стагоддзя*

Палонны Усяслаў разам з сынамі быў вывезены старэйшым з Яраславічаў – кіеўскім князем Ізяславам – у свой стольны горад і там пасаджаны ў поруб. Порубам на Русі называлі падземную вязніцу. Зусім нядаўна такая вязніца сярэдзіны 40-х гадоў XI стагоддзя была выяўлена археолагамі падчас раскопак у Ноўгарадзе. Яна выдатна захавалася, што дазваляе нам добра ўявіць, у якіх умовах утрымлівалі палоннага полацкага князя з сынамі. Наўгародскі поруб уяўляў сабой размешчаны ў яміне зруб памерам 2,3×2,4 м і вышынёй 3,5 м. Унутры поруба меліся дзве драўляныя лавы і неглыбокае адхожае месца па цэнтры глінабітнай падлогі. Кіеўскі поруб Усяслава не меў уваходу, а толькі адно маленькае вакенца, праз якое паступала паветра і падаваліся вада і ежа.

Звычайна чалавек, які патрапляў у поруб, амаль не меў шанцаў выйсці на волю, – нават калі яму і наканавана было праз нейкі час зноў пабачыць дзённае святло, здароўе былы вязень губляў. Таму, пасадзіўшы Усяслава разам са старэйшымі сынамі ў поруб у Кіеве, Яраславічы, напэўна, уздыхнулі з палёгкай і палічылі, што праблема ***«немилостивого на кровопролитье»*** полацкага валадара вырашана раз і назаўжды.



*Польскі вершнік XI стагоддзя (паводле Анджэя Надольскага)*



*Срэбныя зліткі і фрагменты ювелірных упрыгажэнняў са скарбу часоў «Усяслававай Раці» (1060-х гадоў), які быў знойдзены ў 1910 годзе на Верхнім замку ў Полацку (паводле Георгія Штыхава)*

Але зноў сталася інакш. Усяслаў правёў у порубе трынаццаць з паловай месяцаў, пасля чаго быў нечакана вызвалены адтуль паўсталымі кіеўлянамі. Нагодай для паўстання ў Кіеве стала вайсковая параза Яраславічаў ад качэўнікаў-полаўцаў у бітве на рацэ Альце і нежаданне Ізяслава выдаць кіеўлянам зброю і коней для

*Польскія пехацінцы XI стагоддзя (паводле Анджэя Надольскага)*



працягу баявых дзеянняў. У выніку раз'юшаныя гараджане ***«высЂкоша Всеслава ис поруба»*** і абвесцілі яго сваім князем, а Ізяслаў вымушаны быў збегчы ў Польшчу да свайго сваяка караля Баляслава II Смелага.

Так, воляю лёсу Усяслаў імгненна ператварыўся з кіеўскага вязня ў кіеўскага князя – фармальнага вярхоўнага ўладара ўсіх усходнеславянскіх земляў. Здавалася б, усе яго самыя патаемныя мары здзейсніліся нават з лішкам. Але насамрэч да перамогі ці хаця б да трывалага перамір'я было яшчэ вельмі далёка.

Ізяслаў Яраславіч не збіраўся здавацца, і ўжо ўвесну 1069 года ён вяртаецца з выгнання, маючы вайсковую дапамогу ад Баляслава II Смелага. Усяслаў на чале з кіеўлянамі рушыў насустрач ворагу да горада Белгарада. Аднак да бітвы справа не дайшла. Верагодна, Усяслаў адчуваў перавагу сілаў на баку праціўніка і не меў упэўненасці ў баяздольнасці і адданасці кіеўлян. У той жа час, ён выдатна разумеў, што Ізяслаў абавязкова памкнецца адпомсціць за сваё ганебнае выгнанне з Кіева і рана ці позна зноў нападзе на полацкія землі. Ацаніўшы сітуацыю, Усяслаў патаемна пакідае ненадзейнае кіеўскае войска ля Белгарада і вяртаецца ў Полацк, каб найхутчэй наладзіць абарону роднага княства.

Падзеі разгортваліся імкліва. Ізяслаў сапраўды неадкладна наладжвае новую выправу супраць палачан. На жаль, летапісы не ўтрымліваюць ніякіх падрабязнасцяў гэтай вайсковай кампаніі. Вядома толькі, што гэтым разам Усяслаў утрымаць сваю сталіцу не здолеў. На непрацяглы час князямі ў захопленым Полацку становяцца сыны Ізяслава – спачатку Мсціслаў, а пасля яго хуткай смерці – Святаполк.



*Літоўскі вершнік X–XI стагоддзяў (паводле Рымы Валкайтэ-Кулікаўскенэ)*

Ізноў фартуна адварочваецца ад Усяслава, які становіцца князем-выгнаннікам. Аднак, страціўшы сваё княства, ён не страціў стратэгічную ініцыятыву ў вайне і, галоўнае, веру ў сваю перамогу. Ужо ў кастрычніку таго ж 1069 года Усяслаў здзяйсняе новую выправу на Ноўгарад.

Гэтым разам войска, якое ўзначальваў полацкі князь-выгнаннік, пераважна складалася з наймітаў ці саюзнікаў важан – ваяроў з фінскага племені водзь, якое пражывала на паўночным захадзе Наўгародскай зямлі. Акрамя таго, у войску Усяслава, верагодна, былі і іншыя ваяры фінскага паходжання – карэлы, а таксама літоўцы. Звесткі аб гэтым утрымліваюцца ў адной з наўгародскіх берасцяных грамат, якая датуецца 1060–1080-мі гадамі. Каб сабраць такое стракатае ў этнічным плане войска, Усяслаў павінен быў мець значны грашовы патэнцыял. Што наём ваяроў, што мабілізацыя саюзнікаў патрабавалі значных выдаткаў, бо ў першым выпадку ім неабходна было плаціць, а ў другім – заахвочваць

да ўдзелу ў вайне рознага кшталту дарамі. Можна меркаваць, што нават апынуўшыся ў выгнанні Усяслаў працягваў карыстацца шырокай падтрымкай палачан, без якой ён не змог бы так хутка сабраць новае баяздольнае войска.

Аднак гэтым разам поспех быў на баку наўгародцаў. Бітва паміж войскам Усяслава і наўгародцамі на чале з князем Глебам Святаславічам адбылася «***у Зверинця на Къземли; и пособи богъ Глебу князю съ новгородци. О, велика бяше сеця Вожиномъ и паде ихъ бещисленое число***». Разам з тым, ёсць меркаванне, што паражэнне ўсяславава войска тлумачыцца не столькі ўдалымі дзеяннямі наўгародцаў, колькі рознагалоссямі ўнутры яго самога. Ва ўжо згаданай берасцяной грамаце сказана, што «***Литва встала на Корелу***». Вынікам канфлікту літоўцаў з карэламі стала параза ў бітве, шматлікія страты сярод важанаў, якія, напэўна, складалі асноўную частку войска, і палон Усяслава. Аднак пасля бітвы наўгародцы нечакана «***самого князя отпустиша бога деля***». Такое стаўленне да зацятага ворага выклікае здзіўленне, асабліва калі ўзгадаць, які разгром Ноўгарада Усяслаў учыніў усяго за тры гады да таго. Можна толькі меркаваць, што ў полацкага князя ўсё яшчэ заставаліся нейкія козыры ў палітычнай гульні, якія прымусілі наўгародцаў і іх князя адпусціць свайго няўрымслівага палонніка.

Пасля няўдалай спробы нападу на Ноўгарад Усяслаў на некаторы час знікае са старонак летапісаў. Чым ён быў заняты – невядома. Аднак можна ўпэўнена меркаваць, што ўвесь гэты час ён рыхтаваўся да працягу баявых дзеянняў. У выніку, у 1071 годзе Усяслаў выганяе Святаполка з Полацка і вяртае сабе кантроль над Полацкай зямлёй, але цярпіць паразу пад Галацічаскам ад трэцяга Ізяславіча – Яраполка.

На гэтым актыўныя наступальныя дзеянні Усяслава, верагодна, спыняюцца. Відаць, што бесперапыннае змаганне, якое ён вёў на працягу 1065–1071 гадоў, аслабіла эканамічны патэнцыял Полацкай зямлі і да пэўнай



*Святаслаў Яраславіч, мініяцюра са «Зборніка Святаслава» 1073 года*

ступені вычарпала мабілізацыйны патэнцыял яе насельніцтва. Таму Усяслаў мусіў адмовіцца ад вялікіх вайсковых выправаў на суседнія княствы.

Разам з тым, агульная палітычная сітуацыя на Русі склалася для полацкага князя дастаткова спрыяльна. У 1073 годзе супярэчнасці паміж братамі Яраславічамі прывялі да канфлікту. Святаслаў і Усевалад аб'ядналіся супраць старэйшага брата Ізяслава, які вымушаны быў шукаць падтрымкі нават у свайго нядаўняга заклятага ворага – па словах летапісца, ***«Изѧславъ сватитсѧ со Всеславомъ»***. Невядома, ці мелі гэтыя перамовы пэўны плён, але, у кожным выпадку, дапамогі Ізяслаў, відавочна, не атрымаў і мусіў зноў збегчы ў Польшчу.

Аднак усобіца паміж Яраславічамі дала палачанам і іх князю толькі часовую перадышку, а да сапраўднага мірнага жыцця было яшчэ далёка.

## *ТРЭЦІ ЭТАП ВАЙНЫ: АБАРОНЧЫЯ БАІ*

У канцы 1076 года памірае Святаслаў Яраславіч, які на той момант быў кіеўскім князем, а ў 1077 годзе яго месца на працяглы час займае трэці з сыноў Яраслава – Усевалад. Маючы ў сваім распараджэнні велізарныя вайсковыя рэсурсы, Усевалад Яраславіч прадпрымае чарговую спробу падпарадкавання Полацка. Пачынаецца апошні этап вайны, якая разгарэлася яшчэ ў 1065 годзе.



*Абарончая сцяна вакольнага горада Полацка XI – пачатку XII стагоддзя (паводле Сяргея Тарасава)*

Далейшыя падзеі ў пісьмовых крыніцах асветлены слаба і вядомыя дзякуючы так званаму «Павучэнню» сына Усевалада Уладзіміра Манамаха. З яго мы даведваемся, што ўжо ўлетку 1077 года Усевалад Яраславіч разам з Уладзімірам наладзіў вайсковую выправу супраць Усяслава. Галоўнай яе мэтай быў, напэўна, захоп Полацка. Аднак поспеху яны відавочна не дасягнулі. Разам з тым, спыняцца Усевалад таксама не збіраўся.

Можна меркаваць, што паўднёварускія князі да таго

часу амаль зняверыліся ў магчымасці поўнага вайсковага разгрому Усяслава і перайшлі да тактыкі «выпаленай зямлі», мэтай якой было знішчэнне эканамічнага патэнцыялу Полацкага княства і поўнае знясільванне палачан у бесперапынных бітвах.

Новая выправа на Полацк адбылася ўжо ўзімку 1077–1078 гадоў. На гэты раз яе ўзначальвалі Уладзімір Манамах і наўгародскі князь Святаполк Ізяславіч. Узяць горад зноў не атрымалася, хаця, магчыма, такая мэта ўжо і не ставілася. Хаўруснікі задаволіліся тым, што ***«ѡжгоша Полтескъ»*** – выпалілі і разрабавалі полацкія наваколлі. Пасля гэтага Святаполк скіраваўся да Ноўгарада, а Манамах працягнуў нішчыць паўднёвыя і ўсходнія ўладанні Усяслава, рухаючыся ад Полацка праз Одрэск у бок Чарнігава.

Натуральна, што полацкі князь не мог бясконца абараняцца і назіраць, як ворагі паляць падзвінскія і падняпроўскія вёскі і выводзяць у палон яго падданых. Таму ўжо ў 1078 годзе ён скіроўвае свае дружыны да Смаленска. Узяць горад Усяслаў не змог, ды, зрэшты, верагодна, і не надта збіраўся. Магчыма, ён і спадзяваўся знянацку заспець смалян не падрыхтаванымі да абароны, але галоўная мэта выправы была ў іншым. Палачане вынішчылі наваколлі Смаленска, карыстаючыся тымі ж метадамі, што і іх праціўнікі, і імкліва адступілі на сваю тэрыторыю рыхтавацца да цалкам чаканага адказу праціўнікаў.

Доўга чакаць не давялося. Наўздагон абцяжараным здабычай полацкім дружынам ужо мчаўся з Чарнігава Манамах, як ён сам піша ў сваім «Павучэнні», ***«ѡ двою коню»*** – гэта значыць, што



*Наканечнікі стрэл з раскопак Друцка*

яго войска нават не спынялася на адпачынак, а вершнікі проста мянялі стомленых ад шалёнай пагоні коней на запасных. Аднак, нягледзячы на ўсе намаганні, заспець Усяслава за рабаваннем Смаленскіх ваколіцаў Манамах не змог – нездарма ж імклівасць руху полацкіх дружын увайшла ў легенды. Тады ён працягнуў пагоню за палачанамі і рушыў са Смаленска ***«тѢм же путем по ВсеславѢ»***. Але здагнаць полацкага князя Манамах так і не здолеў. Затое ***«пожегъ землю и повоєвавъ до Лукамлѧ и до Логожьска та на Дрьютьскъ воюѭ»*** – чарговы раз выпаліў і разрабаваў



*Лукомльскае гарадзішча (фота Леаніда Аляксеева)*

паўднёвыя і ўсходнія рэгіёны Полацкага княства. Цяжка сказаць, наколькі вялікую шкоду мог нанесці палачанам гэты набег, бо Усяслаў, відавочна, прадбачыў такое развіццё падзей, а таму мусіў загадзя падрыхтавацца да абароны. Нездарма ж ніводнага горада Манамах захапіць не здолеў. Але, натуральна, насельніцтва тых рэгіёнаў, праз якія праходзіла варожае войска, не магло не пацярпець ад рабункаў і гвалту чужынцаў.

Пасля «абмену ўдарамі» у 1078 годзе актыўнасць бакоў пайшла на спад. Усяслаў, відавочна, ужо не імкнуўся да працягу вайны, тым больш, да актыўных наступальных дзеянняў. Яго галоўнай мэтай цяпер была абарона ўласнага княства і максімальнае змяншэнне шкоды ад варожых наездаў. Зрэшты, і кіеўскі князь Усевалад Яраславіч разам са сваімі сваякамі, напэўна, зняверыўся ў магчымасці перамогі над полацкім князем.




*Дзеянні войскаў Яраславічаў і Усяслава на апошнім этапе вайны (1077–1084 гады)*



*Увакняжэнне Усяслава ў Кіеве, мініяцюра Радзівілаўскага летапісу канца XV стагоддзя*



*Дзядзінец Друцка (паводле Вольгі Ляўко)*

Апошнім сполахам зацягненай вайны стаў напад Уладзіміра Манамаха на Менск увосень 1084 года. Маючы войска з чарнігаўцаў і полаўцаў, ён ***«изъѢхахом городъ, и не оставихом у него ни челядина, ни скотины»***. З гэтага паведамлення застаецца не да канца зразумелым, ці здолеў Манамах узяць сам горад. Але апісанне спусташэння паўднёвага памежжа Полацкай зямлі было зробленае самім яго арганізатарам настолькі вычарпальна, што дадаць да гэтага проста няма чаго. Хіба што варта ўзгадаць, што пасля гэтага спусташэння Менск на Пцічы ўжо не здолеў аднавіцца як галоўны гарадскі цэнтр на поўдні Полацкага княства. Замест яго Усяслаў дзесьці пад канец свайго жыцця будуе новы добра ўмацаваны горад, размешчаны пры ўпадзенні Нямігі ў Свіслач. Цяжка ўявіць, што месца гэтае было абрана выпадкова. Відавочна, што абіраючы месца для будаўніцтва новага Менска, Усяслаў імкнуўся такім



*Палавецкі вершнік (паводле Вітольда Свентаслаўскага)*



*Менскае замчышча на плане горада 1773 года (са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь)*

чынам назаўжды пазначыць поле крывавай сечы з Яраславічамі, ушанаваць палеглых на берагах Нямігі паплечнікаў і раз і назаўжды паказаць усім, хто ў выніку стаў сапраўдным пераможцам у гэтай бітве.

Другое спусташэнне ваколіцаў Менска стала апошнім эпізодам у дваццацігадовым зацятым змаганні Усяслава Брачыславіча Полацкага з Яраславічамі і іх нашчадкамі. Цікава, што калі пачатак гэтай вайны стаў нечаканай і гучнай падзеяй і быў адмыслова занатаваны летапісцам – ***«Заратися Всеславъ, сынъ Брячьславль Полотьский»***, дык яе завяршэнне адбылося неяк незаўважна. Напэўна, гэта адлюстроўвае агульную стомленасць абодвух бакоў ад бясконцых баявых дзеянняў, якія чым далей, тым больш станавіліся безвыніковымі і бессэнсоўнымі.



*Менскае замчышча канца XI стагоддзя (паводле Эдуарда Загарульскага)*

Невядома, ці праводзіліся паміж варагуючымі бакамі нейкія перамовы і ці падпісваліся пэўныя дамовы. Цалкам верагодна, што не, бо Усяслаў выдатна ведаў кошт абяцанням Яраславічаў. Але вынікі дваццацігадовай вайны вядомыя добра.

# ВЫНІКІ УСЯСЛАВАВАЙ РАЦІ

На першы погляд, Усяслаў, нягледзячы на ўсе намаганні і доўгія гады жорсткага супрацьстаяння з Яраславічамі, не дасягнуў тых мэтаў, якія ён ставіў перад сабой на пачатку вайны, калі планаваў свае першыя выправы на Пскоў і Ноўгарад. Напэўна, неяк так думаў невядомы аўтар «Слова аб палку Ігаравым», калі пісаў такія радкі:

***Аще и вѢща душа в дерзе тѢлѢ,***
***но часто бѢды страдаше.***
***Тому вѢщей БоянѢ***
***И первое припѢвку, смысленый, рече:***
***«Ни хытру,***
***ни горазду,***
***ни птицю горазду***
***суда божие не минути».***

Але з адлегласці ў дзевяць з паловай стагоддзяў вынікі ўсёй ваенна-палітычнай дзейнасці Усяслава і, у прыватнасці, вынікі адной з найважнейшых падзей у яго жыцці – бітвы на Нямізе – бачацца зусім інакш. Так, полацкі князь не здолеў падпарадкаваць сваёй уладзе ўсе ўсходнеславянскія землі, хаця і пабываў на кіеўскім княжацкім стале. Так, ён не аднойчы цярпеў балючыя паразы, паспытаў долі вязня і выгнанніка. Але гэта не галоўнае.



*Вусце Нямігі, фота 1920 года*

У выніку працяглага змагання са шматразова пераўзыходзячымі варожымі сіламі Усяслаў здолеў стварыць магутную незалежную дзяржаву. Па завяршэнні дваццацігадовай вайны Полацкае княства разглядалася як незалежная дзяржава не толькі яе князем і жыхарамі, але і былымі ворагамі, што асабліва яскрава выявілася ў 1097 годзе, калі адбыўся княжацкі з’езд у Любечы. З’езд быў скліканы, каб абмеркаваць прынцыпы падзелу ўлады на Русі паміж рознымі галінамі нашчадкаў Яраслава з мэтай прадухілення ўсё больш частых міжусобіцаў і наладжвання эфектыўнай сістэмы абароны ад набегаў полаўцаў. У выніку, на Любецкім з’ездзе быў прыняты новы прынцып падзелу княстваў і спадчыннасці ўлады над імі. Ён фармуляваўся наступным чынам: ***«каждый да держит отчину свою»***. Гэта азначала, што кожная галіна Яраславічаў атрымлівала ў спадчыну асобнае княства і больш не павінна была выказваць прэтэнзій на землі іншых адгалінаванняў рода.

Усяслаў, які на той час дасягнуў ужо паважнага веку, не ўдзельнічаў у гэтым з’ездзе, бо яму проста не было чаго дзяліць з іншымі князямі. Тое, што ён сам трымае сваю «отчыну», ні ў кога пытанняў не выклікала. Сваёй упартасцю ў змаганні Усяслаў прымусіў праціўнікаў паважаць імкненне нязломных палачанаў жыць ва ўласнай дзяржаве.

Сёння, амаль праз тысячу гадоў, зразумела, што на берагах Нямігі Усяслаў не проста абараняў сваё княства, – ён адбудоўваў і мацаваў гмах нашай дзяржаўнасці і незалежнасці, закладзены калісьці яго прапрадзедам Рагвалодам. Мацаваў ён гэты гмах

уласнай крывёю і крывёю сваіх паплечнікаў. Зрэшты, нічым іншым ні здабыць, ні ўмацаваць незалежнасць немагчыма. Чырвоныя ручайкі крыві мужных палачан на белым снезе берагоў Нямігі праз стагоддзі праступілі ў колерах нацыянальнага беларускага сцяга. Горад, які Усяслаў пабудаваў праз некалькі дзесяцігоддзяў на месцы былой бітвы, з цягам часу стаў сталіцай Беларусі, увасабленнем усяслававых намаганняў у барацьбе за незалежнасць.

Што можа быць больш яскравым прыкладам перамогі, сапраўднай перамогі, разуменне якой было не даступным для сучаснікаў, але відавочнае для нашчадкаў!



*Бярвёны, якія складалі ўнутраную канструкцыю вала Менскага замчышча, раскопкі 1984–1985 гадоў*

# ЛІТАРАТУРА

**Алексеев Л.В.** Полоцкая земля: Очерки истории Северной Белоруссии в IX–XIII вв. М., 1966.

**Алексеев Л.В.** Западные земли домонгольской Руси. Очерки истории, археологии и культуры. Книга 1. М., 2006.

Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. Т. 1. Мн., 2009.

Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. Т. 2. Мн., 2011.

**Белецкий С.В.** Знаки Рюриковичей. Часть первая: X–XI вв. / Исследования и музеефикация древностей Северо-Запада. Вып. 2. СПб., 2000.

Друцк: Друцк и Друцкая волость (княжество) в IX–XII вв., летопись древних слоев, князья Друцкие и их владения в XIII–XVIII вв., ремесло, промыслы, торговля (по данным археологии, нумизматики, письменных источников), памятники архитектуры и объекты туризма. Мн., 2014.

**Дучыц Л.У.** Касцюм жыхароў Беларусі X–XIII стст. (паводле археалагічных звестак). Мн., 1995.

**Еремеев И.И., Дзюба О.Ф.** Очерки исторической географии лесной части Пути из варяг в греки. Археологические и палеогеографические исследования между Западной Двиной и озером Ильмень. СПб., 2010.

**Еремеев И.И.** Полоцкая земля // Русь в IX–X веках: археологическая панорама. М. – Вологда, 2012.

**Загорульский Э.М.** Возникновение Минска. Мн., 1982.

**Заяц Ю.А.** Заславль в эпоху феодализма. Мн., 1995.

**Заяц Ю.А.** Оборонительные сооружения Менска XI–XIII вв. Мн., 1996.

Ипатьевская летопись. Полное собрание русских летописей. Т. 2. М., 1962.

**Кирпичников А.Н.** Древнерусское оружие. Вып. 1. Мечи и сабли IX–XIII вв. М.–Л., 1966.

**Кирпичников А.Н.** Древнерусское оружие. Вып. 2. Копья, сулицы, боевые топоры, булавы, кистени IX–XIII вв. М.–Л., 1966.

**Кирпичников А.Н.** Древнерусское оружие. Вып. 3. Доспех, комплекс боевых средств IX–XIII вв. Л., 1971.

**Кирпичников А.Н.** Снаряжение всадника и верхового коня на Руси IX–XIII вв. Л., 1973.

**Кирпичников А.Н., Медведев А.Ф.** Вооружение // Древняя Русь. Город, замок, село. М., 1985.

Лаврентьевская летопись. Полное собрание русских летописей. Т. 1. М., 1997.

**Ласкавый Г.В.** К истории оружия Белорусского Подвинья в VI–XIII вв. Статья первая // Полоцкий летописец. № 1 (2). Полоцк, 1993.

**Лихачев Д.С.** «Слово о полку Игореве»: Историко-литературный очерк. М., 1982.

**Медведев А.Ф.** Ручное метательное оружие (лук и стрелы, самострел) VIII–XIV вв. М., 1966.

**Михайлов К.А.** К вопросу о формировании всаднической субкультуры на Руси // Новгород и Новгородская земля. История и археология. Вып. 8. Новгород, 1994.

Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. М.–Л., 1950.

**Олейников О.М.** Темница первой половины XI в. в средневековом Новгороде // Краткие сообщения института археологии. Вып. 228. М., 2013.

**Плавінскі М.А.** Нарысы гісторыі клінковай зброі X–XIII стагоддзяў на Беларусі. Мн., 2009.

**Плавінскі М.А.** Войска Полацкага княства ад часоў Рагвалода да эпохі Усяслава Чарадзея. Мн., 2012.

**Плавінскі М.А.** Узбраенне беларускіх земляў X–XIII стагоддзяў. Мн., 2013.

Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII

вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке. Мн., 2012.

Псковская и Софийская летописи. Полное собрание русских летописей. Т. 5. СПб., 1851.

Радзивиловская или Кенигсбергская летопись. Фотомеханическое воспроизведение рукописи. СПб., 1902.

**Сорокин А.Н., Тянина А.Е.** Из истории древнерусской воинской культуры // Świat Słowian wczesnego średniowiecza. Szczecin – Wrocław, 2006.

**Тарасаў С.В.** Чарадзей сёмага веку Траяна: Усяслаў Чарадзей. Мн., 1991.

**Тарасаў С.В.** Полацк IX–XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія. Мн., 1998.

**Штыхов Г.В.** Древний Полоцк (IX–XIII вв.). Мн., 1975.

**Штыхов Г.В.** Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.). Мн., 1978.

**Штыхаў Г.В.** Крывічы: Па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі. М., 1992.

**Штыхаў Г.В.** Археолагі дапаўняюць летапісцаў. Мн., 2009.

**Штыхов Г.В.** Лукомль: археологический комплекс железного века и средневековья. Мн., 2014.

**Янин В.Л.** Очерки истории средневекового Новгорода. М., 2008.

**Górecki J.** Gród na Ostrowie Lednickim na tle wybranych ośrodków grodowych pierwszej monarchii Piastowskiej. Poznań, 2001.

**Nadolski A.** Studia nad uzbrojeniem polskim w X, XI i XII wieku. Łódź, 1954.

**Nadolski A.** Broń i strój rycerstwa polskiego w średniowieczu. Wrocław – Warszawa – Kraków – Gdańsk, 1979.

**Volkaitė-Kulikauskienė R.** Lietuvai IX–XII amžiais. Vilnius, 1970.

*Навукова-папулярнае выданне*

Серыя «Беларусь у войнах»

**Плавінскі** Мікалай Аляксандравіч

**БІТВА НА НЯМІЗЕ 3 САКАВІКА 1067 ГОДА**

Арыгінал-макет *М.А. Плавінскі, В.І. Ходан*
Камп'ютарная вёрстка *В.І. Ходан*
Карэктар *В.А. Ляйкоўская*

Падпісана да друку 22.08.2015. Фармат 70x100 $^1/_{16}$.
Папера крэйдаваная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 3,1. Улік.-выд. арк. 3,7.
Наклад 200 ас. Замова 2282.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
таварыства з абмежаванай адказнасцю «Медысонт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/142 ад 09.01.2014. № 2/34 ад 23.12.2013.
Вул. Ціміразева, 9, 220004, Мінск.



**Мікалай Плавінскі** -- беларускі археолаг і гісторык, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1981 г. у Мінску. Займаецца вывучэннем гісторыі сярэднявечнай зброі, археалогіі і гісторыі Полацкай зямлі. Аўтар і суаўтар больш як 200 навуковых, навукова-папулярных і энцыклапедычных артыкулаў і 10 манаграфій.



ISBN 978-985-7085-93-4
9 789857 085934